Я. КОЛАС

НАШЫ ДНІ

Я. КОЛАС

НАШЫ ДНІ

Заўважаныя памылкі друку

Стар.	Радок	Надрукавана	Трэба
3	8 знізу	пасланне	насланне
9	2 зверху	паеду	пайду
—	5 "	Я волю ім дам	І я волю ім дам
20	12 "	нэнза	нэндза
23	5 знізу	дружэй	дужэй
32	5 зверху	зарніцы	зараніцы
35	2 "	юнака	юнак
—	7 "	тахлі	ткалі
42	8 знізу	замоўкнуў	змоўкнуў
61	6 "	працэсе	пракосе
78	4 зверху	зоры	зорны
100	10 знізу	Над Навалькарнера,	Пад Навалькарнера,

Я. Колас. Зборнік вершаў „Нашы дні“.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
МЕНСК * МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА * 1937

Я. КОЛАС

НАШЫ ДНІ

1922 — 1936

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
МЕНСК * МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА * 1937

Калгаснае

НАШЫ ДНІ

Праімчаўся віхор, пыл і затхласць размёў,
Сцяг чырвоны разняўшы ўгары...
Мы, таварышы, мы ўладары
Гэтых фабрык, заводаў і вольных палёў.
Зарунела ралля,
Твар мяняе зямля—
Новы засеў вянкі перамогі заплёў.

У нябыт адыходзіць закляцце вякоў,
Гэты здзек, гэты жах кабалы,
Гэта цемра папоўскай імглы,
Гэта тхлань і пасланне ліхіх ведзьмакоў.
Запалілі агні
Большэвіцкія дні
І спалілі нашчэнт звон іржавых акоў.

Не пазнаеш зямлі і вясковых людзей—
Не, не тыя, не тыя яны:
Іншым клопатам людзі паўны,
Крута іх павярнуў большэвік-чарадзей.

Новы гоман наўсцяж,
Замест „мой“ громка „наш“
Вылятае з калгасных шчаслівых грудзей.

Знята ўлада зямлі—векавечны прыгон,
Што пракляццем лажыўся на нас.
Бляск фальшывы навекі пагас.
Я вітаю вялікі, шырокі разгон
Нашых дзён маладых,
Гоман творчасці іх.
Дык ярчэй-жа гары, сонца радасных дзён!

1933 г.

НОЧ

Што за ноч! што за ціш!
Змоўклі травы, краскі.
Усплыў месячык на ўзвыш
Баяць свету казкі.

Неба слухае той сказ,
Хмаркі не схіснуцца,
Толькі зоркі раз-па-раз
Ціха ўсміхнуцца,

Каб сказальніка свайго
Пахваліць, як трэба,
Нават знічкі ў чэсць яго
Асвятляюць неба.

А ён, смутны вартаўнік
Цёмных шатаў ночы,
Засароміўся, і знік
Бляск яго сірочы,

Знік у рунях і ў шаўкох
　　Хмарачак маўклівых,
І гусцей на зямлю злёг
　　Гэты змрок імглівы.

1922 г.

ПЕСНЯ АБ ВЯСНЕ

Уцякай, мароз-дзядуля!
Чуеш ты, стары, ці не?
На пагорках булі-гулі!—
Песні чуюцца вясне.

Звоніць, скача, як дзіцятка,
Гэты жэўжык ручаёк.
На яго, бы тая матка,
Сонца кідае свой зрок.

А ён, гучны і смяшлівы,
Так і ходзіць, аж дрыжыць,
І другі сябрук шчаслівы
Насустрэч яму бяжыць.

Ты паслухай, дзед сярдзіты,
Што там чуецца ўгары?
Што за спеў за самавіты
Ў небе правяць песняры?

А зіма аж пачарнела —
Годзе ёй тут кросны ткаць!..
Гэй, маленства, жыва, смела
Выйдзем весну прывітаць!

А як слаўна каля хаткі
Нам пабегаць, пагуляць!
Ну, зіма: збірай манаткі,
Годзе нас табе ўшчуваць!
Маладая вясна,
Залатая пара!
Будзь красна і ясна,
Не шкадуй нам дабра!

Вокам маткі зірні,
Бледнасць з твару згані!
Дай уздужаць малым
Пад павевам тваім.
Мы вяночак спляцём,
Табе песню спяём.

1922 г.

МАЁЙ КАХАНЦЫ

Я паеду да яе, да каханай маёй,
Каб ізноў яе голас пачуць.
Няхай думкі мае пабягуць чарадой,
Як чародкамі хмаркі плывуць.

Я волю ім дам, дзе ім люба ляцець,
Як лятаді, бывала, даўней.
Палячу з імі сам, буду песні там пець,
Каб адчуць сваё шчасця паўней.

Не скажу толькі я, што мне люба яна
І як добра мне з ёю пабыць,
Бо каханка мая, мая радасць—сасна,
Што пры лесе, як панна, стаіць.

1922 г.

З РАБІНДРАНАТА ТАГОРА

Шапнуў ён: „Мілая, ну, глянь, хоць разік глянь!“
Яму з дакорам я прамовіла: „Адстань!“
   А ён са мной астаўся.

За рукі ўзяў мяне, у вочы мне зірнуў.
„Пакінь!“ сказала я. Ён вокам не змаргнуў—
   І толькі пасміхаўся.

Да вуха мне прыпаў, крануўшыся шчакі.
Абурана сказала я: „Ах, стыд які!“
   Ды стыд яму не стаўся.

Мне кветачкаю ўраз аздобіў валасы.
„Якая-ж карысць ад гэтае красы?“
   І тут ён не крануўся.

І, зняўшы мой вянок, пайшоў ад мяне проч.
Я плачу, думаю аб ім і дзень і ноч—
   Ах, хай-бы ён вярнуўся!

1925 г.

З РАБІНДРАНАТА ТАГОРА

Скажы мне, мой любы, ці праўда ўсё гэта:
Калі мае вочы—узлёты зарніц,
Тады тваё сэрца—адсвет бліскавіц,
Душа-ж ў грымотныя хмары адзета?

Ці праўда, што соладкі вусны мае,
Як лісцік разгорнуты краскі тае?
Што чарамі вёсен цвіце маё цела,
Што песняй, як арфай, зазвоніць зямля,

Як толькі нага па ёй ступіць мая?
Ды то не мана, што і ночка нясмела
Мне ў радасці плача бліскучай расой,
Што я аздабляю і золак сабой?

Ці праўда, што толькі адну мяне ў свеце
Шукала каханне тваё, дарагі,
Блукаючы доўга па свеце тугі,
Каб сэрца сугучнасць пачуць, запрымеціць?

Калі-ж тваё сэрца мяне напаткала,
То радасць, бязмернае шчасце пазнала.

І слодыч пачуў ты ў словах маіх,
У гутарках ціхіх, вачах маіх чорных,

І кудрах дзявочых маіх непакорных,
І ў мне адбіваецца кожны твой міг,
І вечнаю тайнасцю я ўся адзета.
Скажы-ж мне, мой любы, ці праўда ўсё гэта?

1926 г.

НА КАЎКАЗЕ

У залатой калясцы сонца
Вандруе зноў у свет дзянёк.
Нязмеран шлях яго бясконцы,
Завіты ў сонечны вянок.

Замерлі горы ў тонкай сіні,
Глядзіць, як бог зямлі, Эльбрус,
І патыхае сном пустыні
Яго заснежаны абрус.

Маўклівы горы, глуха-немы,
Не жывяць мыслі іх чала,
І вісне мут адвечнай дрэмы,
Як сум хаўтурнага стала.

1926 г.

ПАНСКАЯ ЛАСКА

За вашу ласку панскую,
Палітыку шатанскую
Мы дзякуем, паны.
„Дабра“ зрабілі многа вы,
Залезшы ў наша логава,
Пабраўшы бізуны.

Наслалі нам асаднікаў,
Жандараў і ураднікаў
І іншае брыды—
Кунтушыкаў, каптурыкаў
І Антэкаў-мазурыкаў
Наперлі нам сюды,

Каб гэтыя дабродзеі
Вам польскасць тут праводзілі
На панскія лады.
І польскасць там праводзіцца.
На ўвесь наш край смуродзіцца.
Ксяндзоўская мана.

І веру каталіцкую
Падносяць нам і тыцкаюць—
На чорта нам яна?
Не возьмеш нас касцёламі,
Царквамі і саборамі—
На ліха нам ваш рай?

Таргуйце сабе душамі,
Як рэдзькаю ці грушамі,
А нас вы—не чапай!
Ды ліха ў тым, каханыя,
Што вы прышлі нязваныя,
Убіліся ў наш край.

Зрабілі яго „крэсамі“
І разам з пэпээсамі
Заслалі тут абрус.
Ад Брэста і да Случчыны
Пад пятамі пілсудчыны
Гаруе беларус.

Няма яму аддушыны,
А крык яго прыдушаны
Ўзвялі вы ў крымінал.
Паны! ці мелі рацыю
За крык той судзіць нацыю,
Упасці ў такі шал?

Паны! рэкорд пабілі вы
І як тут не адвілівай,
А роўных вам няма.
І тактыку ксяндзоўскую
І школу мураўёўскую
Прайшлі вы не дарма.

1927 г.

ПАНСКІ ГНЁТ

Няхай паны ў сваёй дурноце
Мацней сціскаюць абцугі,
Каб вас душыць у злосным гнёце,
Каб на калючым панскім дроце
Павесіць скарб ваш дарагі;
Няхай ксяндзы, жрэцы-блюзнеры,
Падпёршы тылакам алтар,
Выводзяць панскія намеры
З „святых канонаў“ свае веры,
Каб болей сталася ахвяр;
Няхай шалее гэта зграя,
Няхай чадзіць „святы“ дурман,
Каб выбіць з беднага ратая
Прагненне к волі таго краю,
Дзе не прышчэпіцца ўжо пан;
Няхай караюць там сурова,
Каб дух народа загасіць:
Хай „ужонд польскі“ слова ў слова
Бярэ прыклады з Мураўёва,
Каб рух спаганіць, ахлусіць,

Няхай „ад мора і да мора“
Жыве ў закручаных мазгах,—
Браты, мінецца ліха-гора,
І панскі шал затхнецца скора,
Бо стукне молат па панах.

1927 г.

ПОЛЬСКІМ КАТАМ

Польшча панскае культуры,
  Польшча—блеск Еўропы—
Залівае турмаў муры
  Крсўю „хамаў хлопаў“!
На намыленай вяроўцы
  Новы „цуд“ Варшавы—
Строяць мудрасць сваю змоўцы,
  Ладзяць баль крывавы.
Страх, трывога ў панскім сэрцы—
  Вецер дзьме з усходу—
І рыхтуюць крыважэрцы,
  На ўсход паходы.
Рып і скрогат надмагільны
  На астрожных брамах,
Кат ваенны і цывільны...
  Кроў... магілы-ямы.
Вар'яцее ў дзікім шале
  Бельведэрскі рыцар,
Часы жудасці паўсталі,
  Бы ў век інквізіцый.

Кропка ў кропку, слова ў слова,
Не змяніўшы моды,
Ідуць следам Мураўёва
Панства ваяводы.
Па засценню здзек, расправа
Дэфензіўных катаў...
Гонар, пан Пілсудскі, слава
Панскім тваім пятам...
Гром арганаў у касцёлах—
Набажэнства „ксендзаў“,
А па местах і па сёлах
Бродзіць голад, нэнза.
Ходзіць крыўда з хаты ў хату,
Сее помсту-злобу
І куе, рыхтуе катам
Гвозд у вечка гроба...
Непакой у панскім сэрцы—
Час іх сходзіць, гіне:
Не спыніць вам, крыважэрцы,
Большэвіцкай плыні.

1931 г.

ПАНАМ-ВАЯКАМ

Забразгалі
„Шабелькамі“
Палкоўнікі-паны.
Не ўрымстуюць
Пільсудчыкі:
Ім хочацца вайны.
З'язджаюцца,
Злятаюцца
Крывавых спраў майстры,
Шушукаюць,
Змаўляюцца,
Падпальваюць кастры,
Каб з дымам іх,
З пажарамі
Зноў рушыцца ў паход.
Мы ведаем
Іх намеры
Магнатаў, ваявод;
Прадонне іх
Палохае—
Гісторыі прысуд.

Шукаюць нам
Пагібелі,
А будзе ім капут.
Палкоўнікі,
Ваёўнікі,
Вам меч ці па плячы?
Прыпомніце
Вы прыказку
Старую аб мячы.

ДА 11-е ГАДАВІНЫ

Ідуць гады сталёвым шыхам,
Гады змагання, перамог,
Стаіўся вораг і прылёг,
На край Советаў чмыша ліхам...
Паціху, злоснікі, паціху:
Не пераступіце парог!

Трашчаць усюды вашы гмахі,
Праела моль стары каптан.
Вам не падняць гнілых сутан,
І не ўратуюць вас ні плахі,
Ні вашы цёмныя замахі,
Ні служак здрадніцкі абман.

Ўстае, расце, мацнее хваля,
Шырэй, дружэй яе разгон,
Імя тэй хвалі—легіён.
Зальюцца ў грозным перавале
Свой час аджыўшыя скрыжалі,
Бо новы пішацца закон...

Ідуць гады напорным крокам,
Гады змагання, перамог.
Ідуць мільёнамі дарог...
Сябры! сачыце пільным зрокам—
Жаданы край ўжо не далёка,
А вораг сілы ўсе напрог!

1928 г.

КРАІНЕ СОВЕТАЎ

Адзванілі званы на званіцах,
І збуцвелі, паніклі крыжы,
Знакі цемры-імжы.
Новы край тут паўстаў з навальніцаў:
Забурлілі другія крыніцы
На шырокай Совецкай мяжы.
У пустых дзірванiстых абшарах,
Патапельніц і багны балот
Дзівы робяцца ў год:
Ажываюць аблогі-імшары,
Загараюцца зоры-стажары,
Асвятляюць вялікі паход.
І спяваюць вятры-самагуды
Гучным звонам у струнах дратоў,
На гітарах слупоў,
Што бягуць, як ганцы з Асінбуду,
Каб працоўнаму вольнаму люду
Прывітанне аддаць хоць без слоў.
Бурны рост. Цвёрды крок. Будаванне.
Зносяць межы ў палях трактары,

Новых дзён песняры,
Тут будуюць сваё бытаванне,
І сімфоніі працы, змагання
Пролетары, зямлі ўладары.
Не пазнаць, Беларусь, цябе сёння.
Разагнаўся працоўны твой люд:
Грукат, шум, гоман, гуд...
Пакацілася ліха ў прадонне.
А калі-ж ты, калі, Занямонне,
Адсвяткуеш свой дзень, як мы тут?
Дык дазволь-жа і мне ты, краіна,
Прывітаць малады твой разгон,
Песню-быль, казку-сон.
А ваякам тваім, хто загінуў
За свабоду, працоўных айчыну,
Мой журботны і нізкі паклон.

1930 г.

ЧЫРВОНААРМЕЙЦЫ

З імглы старога свету,
Дзе ўлада—капітал,
На грозны край Советаў
Насоўваецца шквал.
Там спраў крывавых зграі
Рыхтуюць танкі, газ.
На Вісле, на Дунаі—
Шалёны свістапляс.
Пашлі ў хаўрус ваенны
Баярын і пан-кат,
А з імі друг нязменны,
Французскі адвакат[1].
І пышуць яны злобай
На творчы наш размах,
Ды выкусяць хваробу
Баярын і пан-лях!
Прагніўшыя руіны,
Ваш намысел дурны:

---

[1] Пуанкарэ.

Совецкае краіны
Мы верныя сыны!
На варту мірнай працы
Нас ставіць СССР,
Але калі з палацаў
Памкнецца люты звер,
І ў дзікай сваёй злобе
Зачэпіць вольны край,
На век яго ўгробім!
Фашыст, ты гэта знай!
Мы—чырвонаармейцы,
А гэта—грозны гук!
Гнілыя вашы лейцы
З паганых вырвем рук!
Разбурым планы шпегаў,
Наёмнікаў ліхіх,
І білі мы стратэгаў,
Замежных і сваіх!
Пакрышаны куміры,
Багі пашлі на хлам,
У нашым бурным віры
Магіла будзе вам!
За намі міліёны
Гартованых дружын—
Працоўных батальёны
Паўстануць як адзін!
Хто спыніць іх імкненне?
Адхіліць волі час?
Паток іх вызвалення,
Фашысты, знішчыць вас!

Мы—чырвонаармейцы,
І порах наш сухі,
Праступніцкай сямейцы
Мы вытрасем духі.

1930 г.

ПІОНЕРАМ

Шлях паказан вам шырокі,
Шлях прасторны,
Светлы, зорны,—
Дык наперад цвёрдым крокам,
Шум вясенні, яснавокі!
Дзеці волі, дзеці буры!
Ваша ранне—
Бой, змаганне:
У Кастрычніцкай віхуры
Карані вашай натуры—
Быць гатовым дружна крочыць
Сямімільна!
Звенне шчыльна!
Вышэй сцяг трымаць рабочы!

1930 г.

ЯНКУ КУПАЛУ

(Да 25-годдзя літаратурнай дзейнасці)

Была пара. Марнелі нашы гоні
У холадзе жыццёвых непагод.
Ішоў за годам год,
Маўчаў, цярпеў народ,
Заціснуты, задушаны прыгонам.
Была пара. Знямела слова ў краі
Пад уціскам жандарскае нагі.
У полагу смугі
Разлівамі тугі
Звінеў наш сум на гуслях-самаграях.
Журыліся і плакалі іх струны,
Ды слухалі іх толькі дзірваны,
Балоты, курганы,
Ды ў межах палыны;
Карчма-ж была і школа і трыбуна.
Ды час прабіў, і волі промень глянуў,
Вясёлкаю прарваўшыся з-за хмар.
Знайшоў ты шлях, пясняр,
Пакрыўджаным свой дар
Панёс ты голасам трыбуна і баяна.

Грымеў твой кліч, іскрылася крыніца
Адточаных, як меч, і выкаваных слоў.
У словах тых было—
Нядоля наша, зло
І заклікі да яснай зарніцы.
Прайшлі гады. Магутны віхар дунуў
У цемру—ноч адвечнае жуды.
Самкнуліся рады
Працоўнай грамады
Пад лозунгам сусветнае комуны.
Упаў тыран. Адчынены дарогі.
Мільёны мас—дзяржава і ўладар...
Грымі-ж яшчэ, пясняр,
Нясі працоўным жар—
Грамчэй заві да новай перамогі!

1930 г.

ЯНКУ КУПАЛУ

Я не ведаю, дружа мой, Янка,
Што сказаць табе сёння.
Прамільгнулі гады, як маланка,
У парнаскай пагоні.

Было многа дарог і прыгодаў
І спатканняў пад чарку...
Настрыножыць-бы вас, збегі-годы.
Паскідаць-бы вас з карку.

А ярлык мець „старых“ не цікава,
Няхай бог яго крые.
Не міла табе нават і слава,
Калі скажуць „старые“.

Ды „старымі“ завуць нас па злобе,
Ёсць на гэта прычыны,—
Каб нас проста, як кажуць, угробіць.
А за што? З-за жанчыны.

Яшчэ раз гэта слова пачую,—
Ведай друг мой, Гарацый:
На ўвесь свет свой пратэст пракрычу я:
Заяўлю ў Лігу Нацый.

А ты, Янка, пішы, брат, і крышка.
Старасць тут недарэчы.
Юнаком ідзі ўгору, брацішка,
Разгарні свае плечы.

Не зважай на блазноў, на бязвусых:
Зубаскальства іх—плесень.
Завінешся—напішаш два стусы
Ды якіх яшчэ песень!

Дык няхай-жа жывуць тваё песні
У прыгожых узорах,
І мы вып‘ем за гэта, хоць трэснем:
Хто не вып‘е,—той вораг.

27/V 1935 г.

ЯНКУ КУПАЛУ

Узыйшоў юнака калісьці
На пагорак роднай вёскі.
Калыхаўся сум у лісці,
Млелі песень адгалоскі.

А ў разлогах далеч сініх
Лятуценне тахлі межы.
Слаўся смутак па даліне,
Ды туманам лес мярэжыў.

Крыж пануры, знак пакуты,
Вартаваў дарогі, гоні.
А мужык, худы, разуты,
Рукі з гора клаў на скроні.

Убіраў юнак у сэрца
З'яў тых сумныя акорды,
Каб у вочы крыважэрцам
Кінуць слова гневу, цвёрда.

Клікаў ён народ свой к волі,
Сеяў зерні поўнай жменяй,
Каб дабра яму даць болей,
А каб крыўды стала меней.

І складаў ён песні-былі
Для раздум'я і для ўцехі
Тым, каго з давён тулілі
У хібарках цёмных стрэхі.

Падымаў ён песняй ролі,
Будзіў песняй сон зацяты.
Іх спяваў пастух у полі,
Маладзіцы і дзяўчаты.

Шмат пуцін сходзіў ён з песняй,
Звонкай, яркай, як дзень ясны,
Ды ў імгле было прадвесне,
Цмяны шлях быў яму ўласны.

Толькі бура-навальніца,
Гімн, што Леніным быў спеты,
Ясназорай бліскавіцай
Асвяціла зрок паэта.

Трон упаў. У прах тыраны
Тою бурай былі змяты.
Новы дзень, усход румяны
Гэтым гімнам быў зачаты.

Дык складай-жа, пясняр, далей
Песні сонечным краінам,
Вольным людзям грознай сталі,
Іх узлётам сакаліным.

Дзень наш сёнешні—прасторы,
Зорны шлях прыгожай былі
Тая казка, аб каторай
Людзі толькі цмяна снілі.

Ідуць шляхам тым героі,
Каб здабыць працоўным славу
І свет цалкам перакроіць
І зрабіць комуны справу.

20/XI 1935 г.

„ІСКРЫ ІЛЫЧА“

У пасцельку легла Ганя.
Кончан дзень. Заснуць пара.
Ноч у вычварным каптане
Ціха крадзецца з двара.

І цікуюць зоры з вышкі
Сінявокай грамадой.
А ў Ганусі, у малышкі
Розных думак цэлы рой.

Быў цікавы дзень без меры:
Сонца, яснасць, цеплыня.
А за ўсё лепш—піонеры
І іх забаўкі, гульня.

Скуль іх столькі—дзіва Гані:
Ну як макаў агарод.
І малыя, а ўжо з рання
Правялі ў калгасе сход.

Былі песні, пагулянкі—
Не засне ніяк дзяўча.
А якія ў іх чытанкі,
Кніжкі „Іскры Ільіча“.

Там аповесці, нататкі
Пра звяроў і пра калгас.
А рысункі, а загадкі...
Вось дзе можна бавіць час.

Ціш і сон вакол маўклівы,
А ў Ганусіных вачах
Піонерскі тлум шчаслівы
І іх „Іскры Ільіча“.

1930 г.

ДА ТЫДНЯ „БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ“

Быў такі час ліхі
У забытай, галоднай краіне,
У краіне сахі,
Саламянай страхі,
Дзе век-векам жылі на мякіне.

Безыменны быў край,
І народ свайго імя не ведаў.
Ветру песні пеў гай,
Ды хадзіў смутны бай
Старасвецкі ад прадзедаў-дзедаў.

Лад тут ладзіў бізун,
Ды свістала па спіне нагайка.
На імшарах—багун,
На Палессі—каўтун.
Вось і слынь наша ўся, наша байка.

Бо хто-ж ведаў, скажы,
Аб забытым народзе і краю?

Цемра зману, ілжы
Тут стаўлялі крыжы,
Як слупы па дарозе да раю.

І былі песняры
І складальнікі розных гісторый,
На шурпатай кары
Клалі знак ведзьмары
На людскую нядолю і гора.

Часы шлі ды плылі,
Абдзіралі народ ліхадзеі.
Так вякамі жылі
На „тутэйшай“ зямлі
Без прасветліны і без надзеі.

* * *

Прайшлі гады
Нуды, бяды,
Нястачы,
Плачу і жуды.
У бурны год
Паўстаў народ,
Пайшоў на звод
Пан-абармот.

Разгарнуўся
Голы, босы,
Край ачнуўся
Безгалосы,

У вясёлках,
У blісканні
Заірдзела
Увосень ранне
У агністых,
Палкіх словах
Прамяністасць
Далеч новых.

У бунтарскай завірусе
Быў ратунак
Беларусі.

Край вышаў з цёмных нетраў
У подыхах віхуры,
Ачысціла паветра
Кастрычніцкая бура.

* * *

Замоўкнуў звон хаўтурны
На старых капліцах,
Забурлілі бурна
Новыя крыніцы,

Загулі заводы,
Трактары ў калгасах
Гімны пра паходы
Рабочага класа.

Зарунелі гоні
Сталінскім засевам,
І спявае сёння
Край наш іншым спевам.

А ў Маскве чырвонай
Падрахункі, чыткі:
Беларусь гамоніць
Праз свае здабыткі.

Ды гамоніць стала
З волі дыктатуры.
Пройдзена-ж нямала
Па шляху культуры.

* * *

Былі пуціны розныя,
Блуканні без пуцін,
Пуціны ў часы грозныя
Схадзіліся бы ў клін,

Шырокія і вузкія—
Крывы быў іх разлог,
Краіна-ж беларуская—
Пярэсмыкі дарог.

З іх два найболей бітыя,
Вядомыя шляхі,
Другія ўсе размытыя,
Палын і лапухі.

Адна старая, цёмная,
Дарога абдзірал—
На захадзе, за Нёманам,
Лютуе капітал.

Другая—шыр бязмежная,
На ўсход у новы свет,
Бурлівая, мяцежная,
Як волатаўскі след.

Сагнана цьма халодная,
І шыр усім відна,
Жыві-ж, пуціна ўсходняя:
Ты наша, ты адна!

1931 г.

ДА 15-е ГАДАВІНЫ

Былі гады змагання,
    На ростані эпох—
Агністае блісканне
    Вялікіх перамог.
Ішлі, як хвалі, орды
    З усіх канцоў, граніц
Пад грозныя акорды
    Крывавых навальніц.
Вяла іх помста, змова
    Супроць паўстаўшых мас,
Каб пульс эпохі новай
    Спыніць на вечны час,
Каб жудасным разгулам
    Рабочы стан сагнуць,
А прожарам-акулам
    Уладу зноў вярнуць.
Ды грымнуў клік: „Да зброі!
    Пазіцый не здаваць!
Таварышы-героі!
    Советы ратаваць!“

І рушылі мільёны
Па голасу ЦК—
Сталёвыя калоны
І гарт большэвіка.
Паход іх—гоман буры,
Удары іх—пярун—
За славу дыктатуры,
Советаў і комун.
Ад поўначы панурай
Да сонечных гаёў
Віхрыліся віхуры
Напружаных баёў.
Прасторы Украіны
І таежны разлог,
І горы, і даліны
Дыміліся ў агнёх.
Хіснуўся лёс ваалаў,
І выпаў яго шчыт—
Разбілася навала
Аб Ленінскі граніт...

* * *

Былі гады змагання
На грані двух эпох,
Кастрычніцкіх паўстанняў
Ніхто не перамог.
Ірдзее сцяг чырвоны,
Як водблескі зарніц,
А творчаму разгону
Канца няма, граніц.

У ясныя прасторы
Вандруюць нашы дні,
І ўжо гарацЬ, як зоры,
Дняпроўскія агні.
Скарылася стыхія,
Змяніла свой абраз—
Убачылі й сляпыя,
Што значыць воля мас.
Хоць шлях наш і цярністы,
І труднасцей—мільён,
Ды явай прамяністай
Нас вабіць яснасць дзён...
Праходзіць год за годам,
Выводзіць гмах муроў,
Жывіце-ж вы, паходы
Тытанаў-змагароў!

1932 г.

БУДЗЬМА ГАТОВЫ!

Сышліся прэм'еры,
Фашысты-бандыты,
　　　У вузел спляліся адзін,
І ткуцца іх змовы
Праз чорныя ніты
　　　На супраць Совецкіх краін.

Успенена мора,
Зямля ўзбунтавана,
　　　І глуха вiруюць вiры.
Дзве хвалі, дзве плыні—
Варожыя станы:
　　　Советы і захад стары.

Там крызіс лютуе,
Там крык безрабоцця—
　　　Сістэма старая згніла,
Там побач з раскошай—
Галеча, лахмоцце
　　　І бездані цёмнай імгла.

Тут—праца і творчасць,
І веліч разгону,
І яснасць пастаўленых мэт:
Змаганне ў імя
Вызвалення мільёнаў,
Каб сцерці прыгнечання след.

І блізіцца бура,
Бо круг іх замкнёны,
А разам ім месца няма.
Апошні бой грымне,
Той час неўнікнёны:
Гусцее варожая цьма.

Дзве сілы, дзве плыні:
Стары свет і новы,
І нельга тут згоды чакаць.
Працоўныя, чуйце
І будзьце гатовы
Сусветны Кастрычнік спаткаць!

1932 г.

ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Граніц няма шаленству катаў.
„Душы!“ „Даві!“
„Крыві! Крыві!“
Вот лозунг панскіх дэмакратаў.

Лютуе кат. Растуць магілы,
А на магілах—бур'яны...
Краіны верныя сыны.
Клюе вас „ожэл“ белакрылы.

Працяты жудасцю астрогі,
І стогнам поўняцца муры...
Хвала вам, гонар, змагары!
Не зарастуць вашы дарогі.

Вас судзіць суд прадажнай зграі,
Дзе панскі зброд,
Сумленне кінуўшы за плот,
На „крэсах“ „цуды“ утварае.

А на тых „крэсах“ енк пакуты.
Гібее, чэзне там народ,
А той фашысцкі панскі бот
Ступае помсліва і люта.

О, Беларусь у польскіх межах!
Цябе распялі на крыжы,
Твой дом запоўнілі вужы,
І дзеліць кат твае адзежы.

Але ўсяму ёсць свая мера.
Надыйдзе неўнікнёны час,
І будзе суд загнаных мас—
Адплату ён нясе вам, зверы!

1932 г.

НА ВАРТУ

Крывавыя здані, агністыя бляскі
Фарбуюць манчжурскае неба.
Шакал ненаедны зубамі заляскаў
Ад Токіо і да Сасеба.

Мільёны няшчасных працоўных Кітая
Асуджаны шайкай бандытаў.
Сталіц еўрапейскіх прадажная зграя
Далары бярэ за забітых.

Жандар азіяцкі, японскі пражора,
Ашчэрыўшы воўчыя зубы,
Рве цела Кітая і з сушы і з мора,
Шаленствам запеніўшы губы.

Ён—рыцар „парадку“. Берлін і Варшава
І іншыя цэнтры „культуры“
Авансам вітаюць японца-удава,
Абы ён Советы разбурыў.

Заліты крывёю руіны Чапэі...
Цікавы малюнак дарэмны.
І моўчкі бяздушна глядзіць на падзеі
Сэтльмэнт, квартал чужаземны.

А там, у Жэневе, славутая ліга
У вочы пускае туманы,
І покрыва міру, як сцёртая кніга,
Раз'едзена моллю на раны.

Таварышы, слухай! Шакалы ў паходзе,
Учулі сцярвятнікі трупы.
Сусветны разбойнік, культурнейшы злодзей
Падносіць агонь пад халупы.

Ненавісць і злоба заслала ім вочы,
Бо чуюць, што песня іх спета...
Чырвонаармеец, калгаснік, рабочы!
На варту краіны Советаў!

1932 г.

ЯНЮ

(Прадстаўніку Кітая ў Жэневе)

Ох, бедны Янь, цябе мне шкода:
Як ні спрачаўся ты з Сато,
Не падтрымаў цябе ніхто,—
Такая воўчая іх мода.

Эх, мілы мой. Там многа Джэкаў,
Што выпускаюць трыбухі—
Адпусціць папа ім грахі
За іх крывавую апеку.

Хоць дыпламат ты, бедны Яне,
Да ты наіўны чалавек,
Бо меў надзею, што за здзек
Супроць японца папа ўстане.

Дзівак! ну што такое папа?
Старыя рэзгіны, труна!
Ты чуў адказ ад шаптуна?
Маліцца богу будзе, шляпа.

Каб між Кітаем і Японцам
Быў мір, калі той бог захоча.
Але раса, брат, выесць вочы,
Пакуль узыйдзе тое сонца.

Глядзі, як папавы „авечкі“
Шлюць за даларчыкі рублі
Японцу з зброяй караблі—
І папа будзе мець „на свечкі!“

Дык кінь, брат Янь, ты спосаб гэты.
Вярніся лепш у свой Кітай
Ды за кітайскія Советы
Ты голас голасна падай!

1932 г.

КАЛГАСУ „СЛАБАДА“

Не дужа вялікі калгас „Слабада“,
Ды дужа прыемна яго грамада:
Жанчыны, як вішні, мужчыны—дубы.
А хлопцы, дык хлопцы—гвардзеец любы!

А дзеці! ой, слаўныя дзеці пайшлі!
Яны—аздабленне калгаснай зямлі.
Іх вочкі жывыя і смеласць у іх...
Такіх не бывала ў вёсках старых.

Не надта вялікі калгас „Слабада“,
Ды дружна працуе яго грамада.
Калгас ідзе ўгору, калгас—жывы вір,
Калгаснаю справай жыве брыгадзір.

Работа ў калгасе кіпіць і гудзе.
На месцы і старшыня ў „Слабадзе“.
Глядзіш—і вясною квятнее душа—
Не каюся нават, што выпіў „ярша“.

1933 г.

ШАСНАЦЦАТАЯ ГАДАВІНА

Цвёрды крок жалезнай волі
След пакінуў, як ніколі,
У гэты слаўны год.

Большэвіцкаму напору
Паддаліся скалы, горы
І паўночны лёд.

Гэтай воляй і стыхія
Ў берагі вайшла другія—
Рэкі, вадаспад.

Намаганнем тым геройскім
Па каналу Беламорскім
Пацяклі назад.

У пустэлях Кара-Кума
Гімны пеў маторным шумам
Караван аўто.

То не людзі, а тытаны,
Зразумелі, кім пазваны
Біцца і за што.

І глыбіні стратасферы
Большэвіцкі розум змерыў,
Як ніхто нідзе.

Творчай воляй комуністаў
Шлях пралажаны агністы
Вольнай грамадзе.

Днепрабуд, Магнітастроі...
Слава, гонар вам, героі!
Вораг, чуй, зважай!

Шлях шырокі ў свет адкрыты...
Дык красуй і жыві ты,
Наш Совецкі край!

1933 г.

КАМАНІНУ, МОЛАКАВУ І СЛЕПНЁВУ

Панурая поўнач. Халоднае мора,
Дзе бура выводзіць акорды глухія,
Дзе голага лёду пачварныя горы
Вартуюць сакрэты і тайны стыхіі...

Адважныя людзі Совецкай краіны
Пайшлі ў наступленне на тайны прыроды...
Разбілі, расцерлі судно іх ільдзіны
Пад ярасны скогат пургі, непагоды...

Прыкованы вочы, увага мільёнаў
Да лагера Шміта на здрадлівым лёдзе—
Што будзе з іх лёсам над вірам шалёным?
Хто вызавы кіне халоднай прыродзе?

Найшліся ў краіне Советаў тытаны,
Дзе ленінскі геній трымае стырно:
Праз горы, праз нетры, праз пургі, туманы
Вёў смелы Каманін арліна звяно...

Слепнёў і Каманін і Молакаў хмуры.
Дастойны вы песень вялікіх паэтаў:
Вы пакарылі стыхію і буры
Для гордасці, славы краіны Советаў.

1934 г.

ЗМІТРАКУ БЯДУЛІ

Адсек і ты, Змітрок, тым часам—
Не жарты: дваццаць пяць гадоў.
І па дарозе да Парнасу
Пакінуў многа ты слядоў.

У гэтым доўгім падарожжы
Ты перабраў нямала тэм,
Шмат абразкоў нам даў прыгожых
І шмат аповесцей, паэм.

Ды без таго не абыйшлося—
Навошта нам таіць грахі?
Было ў пісьменніцкім працэсе
Крыху нацдэмаўскай трухі.

Але на свет з цвілога склепа
Ты смела вынес прасушыць
Свайго „Крушынскага Язэпа“
Каб выбіць фуз з яго душы.

А разам з ім даў галерэю
Другіх тыпажаў і асоб,
Не шкадаваў ні акварэлі,
Ні фарб алейных ім на гроб.

Праз „Салаўя“ і „Набліжэнне“
Прышоў ты ў фокус нашых дзён.
Дык хай не ведае зніжэння,
Змітрок, парнаскі твой разгон.

Ты не зважай, што часы крушаць,
Згінаюць постаць нашу, стан
І што „гуменца“ на макушы,
Як месяц свеціць праз туман.—

Дармо: расці і ўглыб і ўшыркі,
Вітай свой дваццаць шосты год
І не зважай на „нашатыркі“—
Ідзі з эпохаю ўпярод.

1935 г.

ПЕСНЯ КАСТРЫЧНІКУ

Вялік разгон,
Шырок размах
Нястрымнай гулкай хвалі.
Мы ў плынях дзён
Праводзім шлях
У сонечныя далі.

І што ні год
Гучней паток
Імкне пад сцяг чырвоны.
Смялее ўзлёт,
Цвярдзее крок—
Ідуць, ідуць калоны.

Вядзе на бой
Іх наш стратэг,
Маяк наш, слаўны Сталін.
Шуміць гразой
Ён, наш разбег,
Імклівасць творчай хвалі.

Глядзім мы ў даль,
У шыр пуцін
Без страху, без трывогі:
Краіна—сталь,
Акорд машын.
То—песня перамогі.

А ўсцяж граніц
Стаіць скала
Байцоў чырвонай раці.
Агні зарніц
Узрок арла—
Ахова нашай працы.

Прайшла яна
Праз громы, дым
І ворагаў скрышыла.
Вайне—вайна.
Жыві наш Клім,
Наш маршал Варашылаў.

Вялік разгон,
Шырок размах
Імклівай творчай хвалі.
У яснасць дзён
Праложым шлях.
Вядзі-ж нас, мудры Сталін.

24/X 1935 г.

ПАМЯЦІ ГЕРОЯЎ

Для радасці, шчасця магутнай айчыны,
Дзе яркія зоры зазз'ялі,
Арлы новай эры снавалі пуціны
У светлыя, вольныя далі.

І зорныя высі былі іх дарогі,
Іх воля цвярдзей ад граніта,
І смерць іх не вырве наш сцяг перамогі,
Хоць сэрца жалобай спавіта.

Мы схілім галовы над свежай магілай,
Дзе прах свой злажылі героі,
І пойдзем іх шляхам з нязломнаю сілай
І сілы айчыны ўтроім.

А памяць аб слаўнай кагорце арлінай,
Што выкаваў геній наш, Сталін,
Запішам у сэрцы, як траур краіны,
Каб нашы патомкі іх зналі.

1935 г.

КОМСАМОЛЕЦ МАЙ

Ідзе Май у паходы, дазоры,
Пад штандарам чырвоным ідзе
Цераз пушчы, пустэлі і моры,
Нестрыманы нікім і нідзе.

Пераходзіць граніцы, кардоны,
Бо хто-ж можа яго затрымаць,
Калі з ім баявыя калоны,
Пролетарыяў грозная раць?

Ідзе Май ў вясёлкавым зз'янні—
Буравей, комсамолец-юнак—
І заве ў прамяністае ранне
Разняволенай працы ваяк.

Няхай цёмная сіла шалее,
Хай зубамі скрыгоча шкілет,—
Зацвіце ва ўсім свеце лілея—
Міжнародны наш Май—агняцвет...

Ідзе Май у вясеннім уборы,
Пад агністым штандарам ідзе
У паходы свае, у дазоры
І магутным разводдзем гудзе...

Прывітаем яго мы, як трэба,
І спаткаем яго, як адзін—
Караваем калгаснага хлеба
І сімфоніяй грознай машын.

27/IV 1935 г.

З ДАРОГІ

(Прысвячаю Заходняй Беларусі)

Мінула шмат гадоў,
І многа змен за час той адбылося!
У подыхах вятроў
Шмат страчана гадоў,
Бы красак тых у выцвіўшым пракосе.

І часта, нібы ў сне,
Мінулае мільгнецца прад вачамі,
Як песня аб вясне,
Аб той, што колісь мне
Няяснымі звінела галасамі.

Пазбыцца гэтых сноў
І з'яў былых не ў сілах я і сёння:
Не-не, ды успомню зноў
Той кут, дзе я даўно
Сагрэты быў пяскамі Наднямоння.

Я свет угледзеў там,
Пазнаў складанасць гам яго і тонаў.

Адчуў дзівосны храм—
Злучэнне блеску, плям,
Дзе ўсё дрыжыць, звініць, напеўным звонам.

І колькі з'яў і чар
У памяці захована з былога!
Дзяцінства ясных мар
Прывабны скарб і дар,
Як першая ў жыццё мая дарога.

Хоць след пуцін маіх
Засыпан там ужо даўно вятрамі,
Я бачу, як жывых,
Мне блізкіх, дарагіх,
Замучаных панамі і царамі.

Дзяцінства сны мае
І вобразы пад нёманаўскім сонцам!
Як часта паўстае
І вабіць і пяе
Акорд, адспеваны і злучаны з бясконцым!

* *
*

Прайшоў час немалы,
К нам светлыя заглянулі дзянніцы,
А там, у бок сулы,
Драпежныя арлы
Дзюб звесілі ў панурай таямніцы.

Па сходзе многіх дзён
Я зноў зірнуў у вочы родным долам...
Зняменне, ціш і сон,
Убоства і прыгон,
За крыжам крыж, астрогі і касцёлы.

Зноў сунуцца з імглы
Забытыя малюнкі і настроі:
„Двухглавыя“ арлы,
Жандар, тупы і злы—
Прыпеўкі усё з той оперы старое!

Вось ён, другі жандар...
Нутро адно, хоць іншае абліччa:
Насунут брыль на твар,
Ён бог тут, ён тут цар
І „польскасці“ ахова ў прыграніччы.

Гляджу, лаўлю вакол
Знаёмыя і выцвеўшыя рысы.
Дзе-ж люд, ярэмны вол?
Спусціўшы вочы ў дол,
Ён ходзіць дзесь, адцёрты за кулісы.

Дзе-ж посулы паноў,
Іх лёкаяў аб роўнасці, аб волі?
У дзвеньканні званоў,
У звоне кайданоў,
У свісце бізуноў,
У голадзе, асадніцтве, падполлі!

Дык вось які ты, край,
Прытулак мар і сноў маіх дзяціных!
Стары снуеш ты бай
Пра царскі, панскі „рай“,
Гаротная, знямелая краіна!

Пасечаны лясы,
І толькі хмыз на торфішчы буяе.
Загоны—паясы,
Ні сілы, ні красы,—
На тыя-ж галасы
Звініш зямля заходняя, старая!

І горкім палыном
Павеяла ад песні, ўжо забытай,
Мой родны край і дом
Пад белым пад арлом!
Нядоляю ты цяжкою спавіты.

І я, твой родны сын,
Чужынцам у табе сябе ўжо адчуваю
Прыміж хоць на ўспамін
Нататку з пуцявін—
Жальбу маю аб лёсе тваім, краю!

1935 г.

ШЧАСЛІВАЯ ХВІЛІНА

Нясе маці з яслей сына,
    Песціць яго, туліць
Ды варкуе з яснай мінай
    Так, каб іх не чулі.

„Брыгадзір ты мой удалы,
    Цвецік свежы макаў!
Як цябе там даглядалі?
    Мо‘ ты ў яслях плакаў?

Не? не плакаў? Малайчына
    Мой калгаснік слаўны,
Мой ударнік, хват-мужчына,
    Трактарыст упраўны.

А я ў полі прыбіраю
    Жыта ў перавяслы
Ды сама сябе пытаю:
    Як мой сын у яслях?

А сынок мой чысты, мыты—
Маладзічок ясны!
І расчэсаны, глядзі ты,
Кудраў яго пасмы.

Вот мой сын які шчаслівы.
Як аб ім тут дбаюць.
Бо ты-ж рунь калгаснай нівы
У Совецкім краю.

А на лета мы адчынім
Яшчэ й сад дзіцячы.
Вось дзе будзе рай хлапчыне!
Вось дзе ён заскача!

А там цацак—падзівіцца!
Ды якія цацкі?!
Ты з іх зложыш дом з святліцай,
Клуб змайструеш хвацкі.

Падрасцеш—вучыцца будзеш
І чым далей—болей,
А кім быці, сам рассудзіш
Сваёй добрай воляй.

Можа будзеш інжынерам,
Можа аграномам,
Бо-ж нам вольны ўсюды дзверы,
Дома і за домам.

Ці ты будзеш лётчык смелы,
Каб у небе плаваць,
Ды прастор яго знямелы
Поўніць лётнай славай.

Праляціш над нашым полем
Ты на самалёце,
Калі я там, мой саколю,
Буду на рабоце.

Загудзе машына ў небе
Пераможна-звонка.
Схісянецца збожжа ў глебе,
Сціхне ў нас гамонка.

Мы рукой прыслонім вочы
Ды зірнем у гору,
Дзе грыміць ён, дзе якоча
Самалёт маторам.

А ён мкне, напорны, бурны,
Грозным ураганам,
Потым робіць круг фігурны
Унь над тым курганам.

Ты скідаеш з самалёта
Мне на павітанне
Ліст ад сына, ад пілота
Калгасніцы Ганне!

Ото-ж матцы радасць будзе
За пілота-сына,
І пахваляць цябе людзі,
Скажуць—наш хлапчына!

Хлопчык з усміхам шчаслівым
Слухае матулю
І да маткі так жычліва
Шчочку сваю туліць.

1935 г.

РАСКУТЫ ПРАМЕТЭЙ

Зашумела, забурліла
    Вольная крыніца,
Ды такая яе сіла,
    Што адно—дзівіцца!
Верне горы, зносіць скалы,
    Запрагае рэкі,
Каб сузор'ямі бліскала,
    Дзе быў мрок век векам,
Каб жывіла рух заводаў
    Электрычным токам,
Ды совецкаму народу
    Несла дзень далёка.
Цуды творыць сіла тая
    На зямлі, на моры,
Ды за воблакі ўзлятае
    К зорам у дазоры.
Разнімае плечы-крылы
    Праметэй раскуты.
Нашы дні—паэмы-былі,
    Сказ нідзе нячуты.

Хто і скуль яны, героі,
Дземчэнка, Стаханаў,
Што ідуць напорным строем,
Крокам веліканаў?
Не было яшчэ на свеце
Ім героям роўных,
Бо такія ужо дзеці
Вольных мас працоўных!
Слава, чэсць табе, Краіна,
І тваім узлётам—
Большэвіцкім пуцявінам,
Сонечным яснотам!

1935 г.

ВОСЕНЬСКАЕ

1

Зачынае гоман вецер непакорны
    На суровы лад.
Халадзеюць ночы. Шлях ярчэе зоры.
    Дні ідуць на спад.
Згорбленая восень под руку з вятрамі
    Клыгае ў імжы
І гірлянд пажоўклых на калгаснай браме
    Гойдае брыжы.
Кончылася лета. Адзвінелі песні,
    Громы навальніц...
Шкадаваў я колісь у сваім прадвесні
    Чуткіх заraніц;
Смуткаваў па леце, як па той каханай,
    Што ўзяла спакой,
І ў цішы самотнай з дум усхваляваных
    Я вянкі віў ёй.
Многа з таго часу дзён сплыло суровых,
    Многа лет прайшло,
І на свет гляджу я сёння з вышак новых
    Праз другое шкло.

Бачу і чытаю іншыя скрыжалі—
Credo нашых дзён:
Вольныя пуціны, сонечныя далі,
Без канца разгон.
І я ў захапленні, радасны і горды
За свой край, народ,
Убіраю ў сэрца дзіўныя акорды,
Творчай сілы ўзлёт...
Вось чаму я сёння не тужу па леце,
Па сваёй вясне
І за тым, што колісь навязаў мне вецер
У юнацкім сне.

29/VIII 1935 г.

2.

ЗЯМЛЯ СОВЕЦКАЯ

Многа было сварак, бояк, калачэчы
З-за цябе, зямелька,
Родная ты наша!
Пільнавалі межаў, хаты свае, печы
Вузенькіх палосак
І гібельнай пашы.

Не жылі—марнелі на ваччу з павязкай:
Свет быў нам зачынен,
Не было разгону.
Сёння гэта ліха—злыбедная казка,
Дзікі сон-навала,
Вынікшы з прыгону.

Выйдзіце на поле, ды зірніце, братцы:
Не акінеш вокам
Польнага разлога!
Гоні—край-прыволле, ёсць аб чым разняцца...
Легла ты шырока
Сельская дарога!

Пазнікалі межы—нудныя адзнакі
Цёмнага бязволля,
Жудкага бязвыйсця—
Шыр і безбярэжжа, дзе вятры-гулякі
Ходзяць станавіта,
Як сваты калісьці.

Гэтакіх прастораў і паны не мелі
І не будуць мець іх,
Трутні, абармоты:
Вырвалі мы з корнем тое пустазелле,
Што смактала сокі
З чорнае галоты.

Час не так вялікі, а якія змены!
І зямля не тая
І не тыя людзі.
Сходзіць быль—пачвара, як ад сонца пена,
У рабоце двабай,
У няспынным гудзе.

Глянеш—не пазнаеш сёння ты краіны:
На балотах-багнах
Выраслі пасёлкі,

Засвяцілі ў цемры замест той лучыны
Ільічовы лямпы
Ветла, як вясёлкі.

Пралеглі ўтульна праз лясы, праз нетры
Ільняным абрусам
Роўныя дарогі.
Едзеш—сэрцу ўцеха. Лічыш кіламетры,
А іх гэтак многа,
А яны так строгі!

А надыйдзе жніва—высыплюць брыгады,
Загрукоча трактар,
Загудуць машыны.
Ці-ж калі мы снілі аб такіх парадах,
Аб рабоце дружнай
Гуртавай сябрыны?

Не цягае маці за сабой калыску
На кастлявай спіне
У жніўны час гарачы.
Не пачуць у полі здушанага піску:
Нашы дзеці ў яслях,
У садах дзіцячых.

І аб нашых дзецях сёння мы не тужым:
Свет ім разгароджан,
Ім дарогі гладкі,
Каб расці і выйсці пакаленнем дужым,
Новым пакаленнем
Большэвіцкай складкі.

Нашы дзеці сёння—самі камандзіры,
Лётчыкі-героі,
Докі-інжынеры.
То-ж яны схадзілі дзікія Паміры
І ў паўночны полюс
Прабіваюць дзверы!

Хто штурмуе неба ды ідзе ў дазоры,
Дзе ніхто ніколі
Не хадзіў у свеце?
Хто спыняе рэкі і злучае моры?
Гэта нашы людзі,
Гэта нашы дзеці!

Гэтакіх герояў ды такіх адданых
Выхавала мудра
Партыя і Сталін.
Сходзяць з зямель нашых мутныя туманы,
Што ні дзень, то болей
Сонечных прагалін.

Вось чаму я сёння, на ўшчэрба лета,
Не тужу па леце,
Як тужыў калісьці,
Бо-ж і песня-радасць намі не прапета,
Бо-ж вясна гучыць мне
І ў пажоўклым лісці.

6/IX 1935 г.

3. УЧОРА І СЁННЯ

Пісала нядоля
Свой напіс закляты
На сценах драўляных
Закуранай хаты.

А сцены буцвелі,
А лес быў той самы,
І злыбедзь стаяла
Дзень-ноч каля брамы.

З саломай па стрэсе
Вятры гаманілі.
Мы слухалі доўга
Суровыя былі

Пра голад, бяспраўе,
Галечу, паборы...
Няветла свяцілі
Халодныя зоры.

У вокны глядзелі
Тужлівыя ночы,
Спявалі завеі
Пра лёс наш сірочы.

Паны-ліхадзеі
Дабро наша жэрлі,
Мужыцкія-ж дзеці
Гібелі і мерлі.

Вось так і жылося
Пад богам і панам,
Ды ўспомніў Кастрычнік
Пра нас занядбаных.

Жахнула маланка
Нясцерпнага гневу,
Агнямі прабегла
Грымотнага спеву.

Апалі туманы,
Смуга векавая,
І вышла ў прасторы
Дарога крывая.

Змоўкла сёння песня ліхаты, жалобы,
Рухнула закляцце вякоў.
І мы сталі людзі, знатныя асобы
Настаяшчай маркі і не нізкай пробы.
Хоць мы дзеці простых бацькоў.
А „мужык“, як мера ганьбы і знявагі,
Кануў вечным правам і квіт.
Мы—народ калгасны, вольныя трудзягі
І зямлі Совецкай горда носім сцягі,
Новае аблічча ў нас, від.
Самі брыгадзіры, самі аграномы—
Партыя дала нам права.
З партыяй прайшлі мы навальніцы, громы,
Страсянулі крэпка панскія харомы.
Біліся з панамі, як львы.

Ды затое-ж сёння ты не згледзіш пана,
Драла за граніцу даў пан
І адтуль цікуе хціва, падзімана.
Глядзі—не глядзі, пан, а зямля забрана,
Сунешся—і згубіш жупан.
І ў палацах панскіх сами гаспадарым,
Ладзім клубы, яслі, сады,
Каб наш пот калішні не загінуў дарам
І канец кладзём мы панскім глупым марам—
Досыць нам ксяндзоўскай брыды.
Сёння мы не тыя, іншыя мы сталі—
Новы нарадзіўся народ,
Перад намі яснасць, ветласць яркай далі,
Партыя нас вучыць, а вядзе нас Сталін.
Смела глядзім мы ўпярод.

4. ЗА НОВУЮ ВЁСКУ

Драўляныя хаты, салома і мох—
Такая старынка, ох-ох.
Сляпыя акенцы, пабітае шкло—
Не хаты, а так барахло.

Кудлатыя стрэхі, ламачыны, гніль—
Не наш ён, не наш гэта стыль.
Эх, хаты-хібаркі! Жабрачы ваш від
Сам просіцца, сам у нябыт

Даволі глядзелі вы ў цемры вякоў,
Прытулкі нуды, прусакоў.

Вы—прыкрыя плямы, вы—шэрая цень.
Што цмяніць наш сонечны дзень.

Вы роблены горам, бядачай рукой—
Пара вам, пара на спакой.
А ваша убоства, сэнс даўніх падзей,
Пакажа нам заўтра музей.

Замест-жа хібарак, панылых цямніц,
Наставім прыгожых святліц.
Аздобім садамі, дамо ім прастор
На наш, на савецкі ўзор.

Каб вока ласкалі і ўтульны былі:
Мы-ж людзі свабоднай зямлі.
Няхай заграніца, зірнуўшы на нас,
Адчуе, што значыць калгас.

25/IX 1935 г.

КОМСАМОЛЬЦАМ

Прывет вам, племя маладое,
Зямель совецкіх яснацвет.
Дарога ваша—шлях герояў,
У новы дзень бліскучы след.

Як сонца першыя ў паходзе,
Стыхіям злым наперакор,
Ішлі вы з песняй, як разводдзе,
На штурмы скал і дзікіх гор.

Ішлі вы, юнасць-чарадзеі
З'яднанай сілай грамады,
Перамагаючы завеі,
Дажджы і суш і халады.

І голас вашай песні звонкай
Лавіў прастор нябёс, зямлі,
І ціш балот, і шчыт сасонкі,
Дзе густа збіліся камлі.

Усюды, дзе патрэбна зброя,
Каб перашкоды ўсе скрышыць;
Вы неслі сэрца маладое
І жар юнацкае душы.

І было крэпка ваша раме,
І не стамлялася рука,
Бо Ленін быў заўсёды з вамі
Быў з вамі гарт большэвіка.

І вам дарогу саступалі
Пустэлі, пушчы і снягі,
Бо даручаў таварыш Сталін
Вам комсамольскія сцягі.

Прывет вам, войска маладое,
Загартаванае ў баях.
Дарога ваша—след герояў,
Былінны эпас—зорны шлях.

Ідзіце-ж гэтак-жа і далей!
Прывет вам, родныя, прывет!
Пад комсамольскай гулкай хваляй
Ці-ж устаіць варожы свет?

1935 г.

ЗАГІБЕЛЬКА

(Прысвячаю К. Крапіве)

„Быў я ў Парыжы на кангрэсе—
То ў Загібельцы, браце, лепш:
Грыбоў няма ў Булонскім лесе,
А ў Сене хоць-бы адзін лешч“.

(К. Крапіва. Эпіграма)

Быць можа я крыху дзівак,
Але люблю я Загібельку:
Там кожны хвойнік мне—сваяк,
Там ясным днём надрэчны гак
Мне суліць мяккую пасцельку.

Хадзіў я там, вітаў усход
І першыя прамені сонца,
Што дзень выводзяць у паход,
А з ім і хмарак харавод,
Замлеўшы смехам на сасонцы.

Запыніш крок. Спакой і ціш—
Былінка нават не схіснецца,
А ты разважліва стаіш,
Бы нейкі сон дзівосны сніш,
І песня нейкая снуецца.

Зірнеш на дол—убогі ён,
Адзін пясок, сухі, нішчымны,
Ды колькі тут наткаў красён
Чаборык, мох, зязюльчын лён
І верасак агніста-дымны!

І колькі мілых красак тут
Разлівам чырвані палае!
Над імі звон, музычны гуд—
На пустцы сонца творыць цуд
І радасць шчодра пасылае.

Ідзеш у свой абход адзін,
Мінаеш сотні паваротак.
Ускрай баркоў шатры хваін
Стаяць у постаці жанчын—
Вітаем іх, як родных цётак.

Ідзеш кілометр, два і тры,
Праходзіш пусткі, пералескі,
А песні сыплюцца з гары
Ды так, што слухаюць бары,
Надзеўшы вычварныя фескі.

А вось і возера-акно,
Якога мала дзе пабачыш,
Такое дзікае яно
Сярод балоцішча адно.
Завуць яго чамусь грымячым.

Само балота—шыр і гмах,
Панурай немасцю акута.
Глядзіш і горне цябе страх.
А хвоек там—мільён папах,
Дзесяткі тысяч парашутаў.

На філасофскі часам лад
Настроіш думкі ты ў самоце.
Што ні кажы, наш край багат.
Балотам зробім шах і—мат.
І будуць нівы на балоце.

Калі агледзіць хвайнякі
І гэты кут пазнаеш бліжай—
Збіраючы баравікі,—
То вывад я раблю такі:
Мне Загібелька лепш Парыжа.

1935 г.

ПЕСНЯРАМ СОВЕЦКАЙ ЗЯМЛІ

Мы расчынім вам дзверы гасцінна
І сустрэнем, як родных сваіх,
Ды на покуць, як быць і павінна,
Вас пасадзім, гасцей дарагіх.

У прыязнай і шчырай бяседзе
Падагулім здабыткі свае,
Што зрабілі і мы і суседзі
І чаго яшчэ нам не стае.

Мы—сям'я маналітнай краіны,
Дзе Советы трымаюць стырно.
Нам, як дзень, нашы ясны пуціны,
На ўвазе-ж мець будзем адно:

Для радзімы свае складаць песні,
Як нідзе і ніхто не складаў,
Каб спявала іх з намі сумесна
Па ўсім свеце адна грамада.

Прывітанне вам, госці, баяны
Неасяжна вялікай зямлі,
Што разводдзем вясеннім з'яднаным
На совецкія гоні ўсплылі.

7/II 1936 г.

У МАЙСКІЯ ДНІ

Пеў я песні калісь
У журботным тоне
Без пустых прыкрас,
Бо не меў я волі,
Бо быў я ў палоне,
Бо такі быў час.
Ліха тое сёння
Адышло далёка,
Зарасло быллём.
Цёмнае прадонне,
Дзе адчай галёкаў,
Знішчана суздром.
Гляну я навокал
Ды зірну я ў далі—
Шырыня, разгон!
Цешаць маё вока
Сонечныя хвалі
Нашых ясных дзён.
Вольныя разлогі
Без мяжы-граніцы,
Гмах калгасных ніў—

Воля перамогі,
Водблескі зарніцы,
Аб якіх не сніў.
На зямлі раскутай
Веснавым напевам
Носяць шум вятры—
Сказ, нідзе нячуты,
Радасць-неспадзевы,
Новыя дары.
І шуміць мне вецер
Роднае краіны,
Як вяшчун-баян:
„Пройдзе Май па свеце
Зорнаю пуцінай,
Разагнуўшы стан.
Няхай вар'яцее
Гітлер цемрашалы
І яго хаўрус:
Май вясною вее,
На пагост з'імшалы
Сцеле ім абрус!"
Ходзіць вецер долам
Лёгкаю паходкай
І вядзе свой бай:
„Пройдзе май вясёлы
Шумнаю паводкай
Пераможны Май!"
Веснавым напевам
Па зямлі раскутай
Носяць шум вятры:

„Большэвіцкім гневам
Знят ланцуг пакуты,—
Вы—гаспадары!“
Песнямі прывета
Ветру ўтораць далі,
А мы ім у тон:
„Дзякуй вам за гэта,
Партыя і Сталін!
Шчыры вам паклон!“

1936 г.

ПРАВАДЫРУ НАРОДАЎ

Вышлі мы ў прасторы
Праз імжу, туманы,
Праз крывавы жах.
Сокал ясназоры,
Генія абраннік,
Сталін, ты—наш сцяг!

Праз гады-сталецці
Марылі аб шчасці
Людзі ўсіх краін.
Але толькі ў свеце
К шчасцю шлях пракласці
Здолеў ты адзін.

Я гляджу ў здзіўленні
З радасцю паэта
На наш творчы ўзлёт.
У вянку праменняў,
Любасцю сагрэты,
Ты вядзеш народ.

І з твае дарогі
Саступаюць горы,
Ледзяны прыбой.
Песня перамогі
На зямлі, на моры—
Спадарожнік твой.

Цьмее дзень ўчарашні.
Точыць на нас зубы
Злы фашыст-вампір.
Але нам не страшна,
Бо ты з намі, любы,
Мудры правадыр.

Вышлі мы ў прасторы
Праз дымы, туманы,
Не схіліўшы сцяг.
Сокал ясназоры,
Любы наш, каханы,
Ты—наш верны шлях.

Праз гады-сталецці
Марылі аб шчасці
Людзі ўсіх краін.
К шчасцю-ж шлях прымеціў,
К праўдзе шлях праклаcці
Здолеў ты адзін.

1936 г.

ГЕРАІЧНАЙ ІСПАНІІ

На варту свабоды і шчасця народаў
Пазвала гісторыя вас.
Мужайцеся, брацце, ў гадзіну нягодаў
І верце—надыйдзе ваш час.

Няхай вар'яцеюць пачварныя здані,
Што свету будуюць астрог:
Яны захлынуцца ў крывавым тумане
Сваіх-жа зладзейскіх дарог.

Яны не пяройдуць мяжы, на каторай
Сурова паўстане Мадрыд.
І знойдзе магілу ў рабочых разорах
І свой і замежны бандыт.

Рыхтуйце пагібель ліхім крыважэрцам,
Што носяць забойства кляймо.
Мы з вамі заўсёды і ў мыслях і сэрцам
І руку мы вам падамо.

Прымі-ж прывітанне ад вольнай краіны
Працоўны Іспанскі народ!
Жалезнай кагортай з'яднанай сябрыны
На ворагаў дружна ўпярод!

* * *

Эх, словы! чаму вы
Не віхар, не гром?
Пастроіў-бы вам я
З паветра паром,

Падняў-бы высока
У смутную сінь,
Мінуўшы прасторы
Чужых далячынь.

Праз горы і моры
Пранёс-бы я вас
Над Навалькарнера,
Мадрыд, Ільескас.

І з высей блакітных
Дажджом агнявым
На голавы-б рушыў
Забойцам ліхім.

Каб знішчыў дашчэнту
Ваш бурны палёт
Наёмнікаў Рыма
І Гітлераў зброд...

Эх, словы! чаму вы
Не віхар, не гром?
Чаму вас не рыну
Агнём, пяруном?

ТАНІНА ТАЙНА

Ходзіць Таня ў задуменні,
Хмурыць бровы.
Што з ёй стала?
І на Таню ў недаўменні
Брыгадзір глядзіць суровы—
Каго Таня пакахала?

Заклапочан твар у Тані.
Зораць вочы
Дзесь далёка.
Пэўна марыць аб каханні
Сэрца палкае дзявоча—
Не зманеш людскога вока.

Таня песень не спявае
І не ходзіць
На гулянкі.
Што-ж? праява то людская,
І каму каханне шкодзіць.
Але хто яе каханкі?

У людзей свае дагадкі.
Толькі-ж людзі
Не прарокі!
Не—не тыя непаладкі
Не—не тое томіць грудзі
Маёй Тані яснавокай.

Сама-ж Таня маўчыць горда...
Дзе напасці?
Дзе прычына?
—Перакрыць, пабіць рэкорды
Свае прыяцелькі Насці.—
Вось што думае дзяўчына.

1/XI 1936 г.

ПЕСНІ АБ ІМПЕРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЕ

І. ПЕСНЯ САЛДАТКІ

Гнуцца лозы над крыніцай
Ды шумяць тужліва.
Ідзе гора з маладзіцай
На цяжкое жніва.

Зачыніла свет вайна,
А я з дзеткамі адна,
З дробнымі, малымі
Цяжка адной з імі.

Вее вецер па-над борам,
Ходзячы па свеце.
Ой вы, сонца, месяц, зоры!
Праўду мне скажыце:

Дзе мой горкі бедачына
Мой салдат пахілы?
Без яго мне, сіраціне,
Белы свет не мілы.

Зачыніла свет вайна,
А я з дзеткамі адна,
З дробнымі, малымі
Цяжка адной з імі.

Ці жывы ён, ці забіты,
Ці ў чужым палоне?
Шапаціць мне штосьці жыта,
Ды слоў не гамоніць.

У каго-ж я запытаю?
Нема ўсё навокал:
Дзе ты, дзе, у якім краю
Мой нявольнік-сокал?

Зачыніла свет вайна,
А я з дзеткамі адна.
Горка мне адненькай,
Сумна маладзенькай!

II

САЛДАЦКАЯ ПЕСНЯ

Старана чужая—не родная маці,
А касцей салдацкіх нагацілі гаці.
Эх, ваюй, ваюй, салдат!
Выступай за радам рад!

За гарой, за лесам ліха, смерць блукае,
А крумкач у госці крумкача склікае.
Эх, ваюй, ваюй, салдат!
Па зямлі паўзі, як гад.

У сырых акопах гіне люд рабочы
А там дома жонка праплакала вочы.
Эх, ваюй, ваюй, салдат
За цара, за царанят.

Над зямлёю цяжка злегла ноч сляпая,
А ў каго матуля пра сынка спытае?
Эх, ваюй, ваюй, салдат!
Не аглядвайся назад!

Рассяваеш косці ты, салдат, па свеце,
А там з галадухі пухнуць жонка, дзеці.
Эх, ваюй не так, салдат:
Павярні ты штых назад!

1936 г.

III

НОВАЯ ПАХОДНАЯ

Рушым дружна грамадою
На паноў у свой паход,
Скончым з панскаю брыдою
І адвечны знішчым гнёт!
Эй, гарніст, іграй паход!
Дружна, армія, ўпярод!

Разгарні ты, люд рабочы,
Сілу, волю ва ўсю шыр,
Зграі рознай патарочы
Улажы на век у жвір!
Эй, гарніст, іграй паход!
Смела, ратнічкі, ўпярод!

Узнімайся сцяг чырвоны,
Да ўгары агнём шугай
І над светам паланёным
Ясным сонцам заіграй!
Эй, гарніст, трубі паход,
Дружна, армія, ўпярод!

Развязаў нам Ленін вочы,
Расказаў дзе шчасце, мір.
Разгарніся-ж, люд рабочы,
Ва ўсю моц сваю і шыр!
Эй, гарніст, трубі паход,
Грамада, валі ўпярод.

1936 г.

ПЕСНЯЙ ВІТАЮ Я ВАС

Леглі шырока нівы калгасаў.
Глянеш—разлог, далячынь.
Стужак дарожных роўныя пасы
Мераюць смужную сінь.

Ходзіць паважна дбалы араты,
Трактар—палёў гаспадар,
Дужы і ў працы спорны, заўзяты,
Ходзіць, гамоніць абшар.

Скінуты межы, свет разгароджан—
Далеч, бязмежны прастор.
Яснае заўтра, дзень наш прыгожы,
Досвіткаў тысячы зор!

Змоўкла ў прасторах песня старая,
Скаргі адвечны палон:
Вольная праца нас адарае
Песняю радасных дзён.

Песні гавораць—жыць стала лепей,
Песні, як мак, расцвілі,
Поўняцца імі горы і стэпы
Нашай Совецкай зямлі.

Плаваюць песні звонам-разлівам,
Песні расквечаных дзён,
Песням вясёлым, песням счаслівым
Хочацца ўторыць у тон.

Марш перамогі ў радасным гудзе.
Хіба-ж не радасць наш час?
Краю Совецкі, новыя людзі!
Песняй вітаю я вас!

1936 г.

ДЗЕД-КАЛГАСНІК

Калгасная хата. Багоў ані следу.
Угоднік святы Мікалай
Не рупіць сягоння калгасніку-дзеду—
Газеты яму падавай.

На сценах—выдатныя, здольныя людзі—
Ударнікі і правадыры,
Што волі імкненне да радасці будзяць,
На землю рай зносяць з гары.

І дзед гэтак сама не лыкам падшыты:
Ударнік. Яму, батраку,
Сам маршал Будзённы, яздок знамяніты,
З падзякаю ціснуў руку.

У дзеда на стайні такія ўжо коні,
Што хоць з іх малюнкі пішы,
А сядзеш, і вецер цябе не дагоніць,
Як бура прамчыць па шашы.

Гарыць над абрусам не тая газоўка,
Не тая куравасць карча,
А лямпа, што свеціць як сонца ў пятроўкі—
Дзівосны агонь Ільіча.

Паважная постаць у дзеда Грыгора:
Уздзеў акуляры на нос,
І мыслі пабеглі кудысь аж за мора,
Дзе чыйся рашаецца лёс.

Ён так углыбіўся ў газеты! Чытае,
Эх, грозны падзеяў развой!
Куды завядзе інтэрвенцыя тая,
Той наглы фашысцкі разбой?

Куды яна прэцца, фашызма агіда?
Не ёй-жа на свеце ўладаць?
І дзед разважае аб лёсах Мадрыда
І як яму помач падаць.

А потым адводзіць свой зрок ад газеты
І родны прыгадвае край.
За шчасце, за волю, за край родны гэты,
Ну, хто не паўстане, спытай?

10/XI 1936 г.

САБЕ і СВАІМ РАВЕСНІКАМ

Ідуць за падзеяй падзеі,
За годам праходзяць гады.
Зірнеш на сябе, добрадзеі,—
Эх, дзе-ж ён, твой час малады!
Глядзіш—насядаюць маршчыны,
У вусах блішчыць сівізна...
Калі, ну калі вы, часіны,
Зрабілі старога з блазна?
Няма тае лёгкасці, спрыту,
Бурчыш, асуджаеш грахі:
Гарэзнасць свая ўжо забыта,
Цішэеш, як вечар глухі.
Звычайная, простая з'ява,
Закон адзінакі для ўсіх,
А ў люстра зірнеш—не цікава,
Няўзнак засумуеш на міг.
Ды чорт яе, з той сівізною:
Хай лысіна свеціць, як блін,
Ты-ж клыгай старэцкай ступою,
А думай—мне дваццаць адзін!

13/XII 1936 г.

СТАЛІНСКАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ

Разгарнуў магутна раме
Край наш сталінскаю воляй.
Шмат чаго здабыта намі,
А здабудзем яшчэ болей.

Пройдзен шлях вялікі, трудны,
Мы—на радасным прывале,
На тым сходзе многалюдным,
Дзе лунае імя Сталін.

Ў нашым сэрцы гэта імя,
І на нашых вуснах—Сталін.
Свет законы яго ўспрыме,
Як людскіх свабод скрыжалі.

Не было нідзе спрадвеку
У жыцці такіх прагалін,
Дзе-б пашану чалавеку
Аддалі, як дае Сталін.

Правадыр наш, добры геній!
Праз вякі, праз часаў далі
Усім новым пакаленням
Сімвал шчасця будзе—Сталін.

1936 г.

З М Е С Т

Тэхрэдактар АБРАМАВА
Рэдактар БУТЭЛІН
Карэктар Т. АДАМОВІЧ

Здана ў друкарню 19/V-37 г. Падпісана да друку 4/IX-37 г. Аб'ём $3^7/_8$ друкаваных аркушаў. Папера $72 \times 105^1/_{32}$. Знакаў у друк. аркушы 50000. Тыраж 5000 экз. Зак. № 535. Уп. Галоўлітбела № 341. Зак. ДВБ № 206.

Школа ФЗВ друк. ім. Сталіна.

все издание
+
jpg обложки
тит. лист